CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

MOB 2017

**UZUPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD | PESEL

*miejsce na naklejkę*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

DATA: **24 maja 2017 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS PRACY: **180 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **40**

**UZUPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia ucznia do:

☐ dostosowania kryteriów oceniania

NOWA FORMUŁA

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 8 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-R1_**1**P-172

Układ graficzny
© CKE 2015

MOB 2017

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На аснове дадзенага фрагмента тэксту прадстаў праблему і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісамі і думкамі Дзяніса Філіпчыка і спашліся на іншыя тэксты культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Дзяніс Філіпчык

*Міжнародны досвед у захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны*

[…] У апошні час стала вельмі модна гаварыць пра захаванне нашай спадчыны. Толькі паспявай сачыць за інфармацыяй пра з'яўленне новага помніка, пра рэстаўрацыю (правільную ці няправільную на думку журналіста) архітэктурнага аб'екта, з'яўленне новага музея... І калі да таго, што матэрыяльную спадчыну трэба захоўваць, мы ўжо прызвычаіліся, то да магчымасці захавання нашых нематэрыяльных скарбаў, здаецца, яшчэ не. […]

Ужо ў XIX стагоддзі культурную спадчыну пачынаюць разглядаць як нешта ўніверсальнае, што з'уляецца значным не толькі для людзей, якія ёй валодаюць ці жывуць каля яе, але і для рэгіёна, краіны ці нават усяго чалавецтва. […]

У адрозненне ад паняццяў „культурная спадчына" і „культурная каштоўнасць", паняцце „нематэрыяльная спадчына" пачынае фарміравацца даволі позна. Толькі калі працэсы трансфармацыі традыцыйнага грамадства і глабалізацыі пачынаюць усё больш уплываць на шматлікія праяўленні традыцыйных культур, паступова прыходзіць усведамленне таго, што гэтыя праяўленні таксама трэба захоўваць. Востра паўстае і пытанне неабходнасці перадачы элементаў культуры новым пакаленням.

Заходняе разуменне культурнай спадчыны як таго, што ўвасоблена ў матэрыяльных творах мастацтва і архітэктуры, доўгі час выключала паняцце нематэрыяльнай спадчыны з поля зроку міжнароднага заканадаўства. […] Вынікам міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы нематэрыяльнай культурнай спадчыны стала прынясце ў кастрычніку 2003 года канвенцыі „Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны", […] паводле якой да нематэрыяльнай культурнай спадчыны адносяцца „звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў межах іх навакольнага асяроддзя, ва ўзаемадзеянні з прыродай і іх гісторыяй, а таксама фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці, садзейнічаючы там самым павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека".

Захаванне і зберажэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны – гэта не яе кансервацыя. Калі мы проста запішам тэкст песні, здымем на відэакамеру абрад ці свята, запішам казку бабулі, мы нашу спадчыну не захаваем. Галоўным крытэрыем таго, што тая ці іншая з'ява адносіцца да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, з'уляецца яе жыццяздольнасць. Гэта спадчына павінна перадавацца з пакалення ў пакаленне і не можа застыць, ператварыцца ў нешта нязменнае. […]

Спадчыну неабходна не проста зберагаць і захоўваць, яе трэба выкарыстоўваць. У гэтым выпадку яна актуалізуецца, становіцца запатрабаванай і ўсведамляецца як сапраўдная каштоўнасць. […]

Д. Філіпчык, *Міжнародны досвед у захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны,* Маладосць № 6 (739) чэрвень, 2015, с. 152–156.

**Тэма 2. Зрабі параўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Якуб Колас

***Родныя вобразы***

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня магутных дубоў...
Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

1908

Я. Колас, *Родныя вобразы* [у:] *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя,* Мінск 2004, с. 285–286.

Максім Багдановіч

***

Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца прагляну́ў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.

Знічка коціцца агністаю слязой,
Прашумела мякка скрыдламі сава;
Бачу я, з прыродай зліўшыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую ў цішы, як расце трава.

http://knihi.com

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

............................................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| wypowiedź argumentacyjna | A. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| | B. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| interpretacja porównawcza | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 2 | | |
| | D. | 0 – 3 – 6 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 2 – 4 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

**BRUDNOPIS***(nie podlega ocenie)*